Н. А. ЛОЙКА

# РЭАЛІЗАЦЫЯ АКТА ЛЮБЛІНСКАГА СОЙМА 1569 г. У ГІСТАРЫЧНАЙ РЭЧАІСНАСЦІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI — ПАЧАТКУ XVII ст.

Другая палова XVI ст. з'явілася лёсавызначальным часам для Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і іншых земель, калі дзяржава стаяла на грані страты незалежнасці ад дыпламатычна-інкарпаратыўнай агрэсіі заходняга суседа — Польшчы, і ваенна-інтэрвенцыйнай — усходняга, Масковіі. На мяжы драматычнага супрацьстаяння цалкам захаваць суверэнітэт адной з былых магутнейшых краін Усходняй Еўропы не ўдалося. З прычыны, у першую чаргу, мажлівага далучэння ВКЛ да Расійскай дзяржавы, значных тэрытарыяльных страт на ўсходзе і поўдні, велікакняжацкі ўрад пайшоў на унію з Каралеўствам Польскім, якая была заключана ў Любліне 1 ліпеня 1569 г. Тым не менш, палітычная эліта ВКЛ — шляхецкае саслоўе, якое на працягу XIV — першай паловы XVI ст. прайшло стадыю афармлення і стала палітычна вызначальнай сілай у краіне, у першыя паслялюблінскія дзесяцігоддзі старалася па мажлівасці дыстанцыравацца ад заходняга партнёра і вытрымліваць палітычную лінію, скіраваную на самастойнае бачанне і выражэнне ўнутры- і знешнепалітычных праблем. Аб гэтай пазіцыі яскрава сведчаць матэрыялы пасяджэнняў шляхецкіх соймікаў ВКЛ, у тым ліку беларускіх паветаў гэтай дзяржавы.

Для першых паслялюблінскіх дзесяцігоддзяў характэрна ўспрыманне шляхтай беларускіх земель нядаўняй заходняй суседкі, а цяпер адзінадзяржаўнага чынніка — Польшчы, усё ж менавіта як суседняй дзяржавы. Гэта вынікала з таго, што ўражанні для пануючай эліты ВКЛ ад перадлюблінскай палітыкі Польшчы і зместу унійнага акта былі шокавымі. Прычым як для магнацтва, так і для шляхты, якая ў свой час дамагалася злучэння з Каронай. Для вышэйшай уплывовай знаці Люблінская унія пагражала стратай былога палітычнага вяршэнства, бо ў агульны сенат Рэчы Паспалітай шмат былых паноў радных проста не траплялі. Тое ж самае адбывалася і на вальным Сойме, дзе з 180 выбраных на сойміках па ўсёй Рэчы Паспалітай паслоў толькі 46 прыходзілася на ВКЛ (з іх 34 з беларускіх паветаў) [4, *127—128*].

Адразу неадчувальная палітычная дыскрымінацыя дапаўнялася вельмі адчувальнай для дзяржавы і для шляхты эканамічнай агрэсіяй Польшчы, калі яна ў сакавіку — чэрвені 1569 г. далучыла да сваёй тэрыторыі багацейшыя велікакняжацкія землі Валыні, Падляшша, Падолля і Кіеўшчыны. Дзяржаўны скарб пад час вайны з Маскоўскім княствам недалічыўся фантастычнай сумы падаткаў, войска панесла колькасныя і матэрыяльныя страты, а для прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя ВКЛ атрымліваць землі ў тых рэгіёнах стала цяпер вельмі праблематычна. Плюс да гэтага

для мясцовай шляхты з'явіўся небяспечны канкурэнт у атрыманні зямельных падараванняў і службовых пасад у паветах, бо згодна Люблінскай пастанове: «...як паляк у Літве, так ліцвін у Польшчы вольны набываць сумленным чынам маёнткі і валодаць імі на падставе правоў той краіны, дзе гэтыя маёнткі знаходзяцца» [2, *154*]. Безумоўна, гэткае становішча нараджала ў большай часткі шляхецкага саслоўя (ды не толькі) ВКЛ насцярожаныя, часамі непрыязныя настроі ў дачыненні да польскіх «братоў».

Непасрэдна ў палюблінскі час цэнтральны ўрад ВКЛ пры падтрымцы рэгіянальных уладаў стараўся, па магчымасці, самастойна вырашаць унутры- і знешнепалітычныя праблемы. Найперш дзяржаўнымі дзеячамі ВКЛ, соймікавымі дэпутатамі яшчэ да заключэння уніі не аднойчы выказвалася польскаму боку шкадаванне аб страце паўднёвых зямель і патрабаванне аб іх звароце. У гэтым плане характэрна фраза канцлера Астафея Валовіча, што была ім моўлена 10 сакавіка 1569 г.: «... здавна ку Великому князству Литовскому належало, и кгдыж земли Подлешское и Волынское иначей не розумею и розуметь не могу одно же Великое князство Литовское належить и присегою его королевской милости и подданых оного панства утвержоно, то ест Великому князству, а не Короне...». На працягу недзе палутара дзесяткаў паслялюблінскіх гадоў пастаянным пытаннем, што разглядалася на соймікавых пасяджэннях у велікакняжацкіх паветах, з'яўлялася патрабаванне да караля аб вяртанні ў межы ВКЛ украінскіх абшараў. Напрыклад, інструкцыя паслам ад Віленскага ваяводства на каранацыйны сойм 8 мая 1573 г. утрымлівала наказ «о земли Киевскую, Волынскую, Подляскую и Браславскую от сполку стародавного Великого князства Литовского, не через застоновенье унии отлучоных, абы тые земли зася до Великого князства Литовского по давному обычаю были прывернены. И мають панове послове обывателей оных земль, на том сойме будучых, яко братьи наше милое и ласкавое, прозбою ужывати, иж бы на давную повинность, и кревность нашу сполную помнечи, до одного сполку з нами знесли». Далей тлумачыцца неабходнасць гэтага кроку «для поратованья прудшого часу небезпечного от навалности прудких непрыятелей наших сполных: Москвы и татар. А не мней теж и с тое прычины, абы ся скарб земский литовский не умнейшил, маючи великий налог вотправованю многих потреб земских и вопатрованю замков украинных тутошнего панства, которые водле потребы осмотрены быть не могуть за отлученьем тых земль и доходов в них от скарбу земского Великого князства Литовского». Такім чынам, менавіта патрэбы абароны ад усходніх і паўднёвых непрыяцеляў, як павінны былі даводзіць агульнаму сойму Рэчы Паспалітай віленскія паслы, прымушалі, «иж бы первей земли вышей поменёные от Великого князства Литовского отлучоные, зася до того панства были привернены, и оборона того панства слушне была пастановлена» [1, а. 1; № 93, а. 4]. Але ўсе запыты шляхецкіх соймікаў да цэнтральных уладных структур Рэчы Паспалітай плёну так і не далі. Украінскія землі ад 1569 г. лічыліся часткай Каралеўства Польскага, што прынесла Кароне вялізныя клопаты падчас казацкага руху сярэдзіны XVII ст.

Адносіны паміж двума чыннікамі канфедэратыўнай Рэчы Паспалітай мелі абвастрэнне, а хутчэй ахалоджванне ці расквататараванне ў час бескаралеўяў. У гэтыя прамежкі, па-першае, трэба было разлічваць толькі на свае ўласныя сілы, каб абараніць дзяржаву, свой дом ад знешніх ворагаў. Аб гэтым сведчыць адозва Крыштафа Радзівіла, найвышэйшага гетмана ВКЛ, да шляхты ваяводства Віленскага і да «ўсяго

велікакняжацкага рыцарства», якая датавана 15 снежнем 1587 г. У ёй высокі ўраднік даводзіў да шляхецтва, «иж мне доходят слухи и новины частые о готовности з неприятелской земли, з Москвы». У гэтай сітуацыі гетман заклікаў «вси вобец и каждый засобна, почавшы от большого аж до меншого стану, в домех своих, яко до потребы военное поготову быт» [1, а. 1—2].

Па-другое, выбарнасць караля прыводзіла да рознасці ў падтрымцы таго ці іншага боку, той альбо іншай кандыдатуры, што суправаджалася, як адзначала 6 верасня 1587 г. шляхта Лідскага павета на сваім сойміку, «разорваньем межи их милостями паны радами, послами и рыцерством обойга народу, так короны Полское, як и Великого князства литовского у выбираню пана..., зачим до великое и близкое згубы и упадку Речы Посполитое занеслося...» [1, а. 1].

Па-трэцяе, уяўная напружанасць у адносінах паміж кіруючымі коламі дзвюх частак Рэчы Паспалітай вынікала з прычыны ігнаравання польскім бокам думак і мажлівасцей ліцвінскіх судзяржаўнікаў у час выбарчай кампаніі. Так, паны рады ВКЛ у сваёй адозве ад 8 студзеня 1587 г. да велікакняжацкай шляхты аб скліканні соймікаў дзеля выбараў паслоў на вальны сойм у Варшаву выказвалі прэтэнзіі «до всих их милостей панов рад коруны Полское», што «велико важных справ Речы Посполитое не хотечы без ваших милостей брати нашое отправовати». Нават дату склікання элекцыйнага (выбарчага) сойма вызначылі «без ведомости нашое, не поразумевшысе з нами.., же се нам в том великое уближене деет» [1, а. 1—2].

Адсутнасць адзінства паміж каронай і княствам падчас бескаралеўяў кідалася ў вочы нават іншаземным назіральнікам. 31 кастрычніка 1572 г. французскі рэзідэнт у Вене Д. Вулькоб у лісце да караля Францыі Карла IX, брат якога Генрых дэ Валуа прэтэндаваў, а потым заняў месца караля Рэчы Паспалітай, выдзяляў сярод «галоўных разладаў і рознагалоссяў, што моцна запавольваюць элекцыю караля, ...нязгоду Літвы з палякамі» [5, *21*].

Пазіцыйным стрыжнем у адносінах велікакняжацкай шляхты з польскай «братею» ў часы безуладдзя з'яўлялася тое, каб «народ литовский ровную моц и владзу во всём мел з народом польским» [1, а. 8]. Ад новага манарха ліцвінскаму боку трэба было дамагацца гарантый захавання сваіх былых правоў і прывілеяў, а, па мажлівасці, дабівацца новых на сваю карысць. Менавіта ў такім ракурсе выстаўляліся патрабаванні шляхты да толькі што абранага караля Рэчы Паспалітай Генрыха Валуа, якія акумуляваліся ў грунтоўнай інструкцыі, што была выдадзена паслам на каранацыйны сойм 1573 г. ад Віленскага ваяводства.

Галоўным лейтматывам шляхецкага наказу з'яўлялася карэляцыя акта Люблінскай уніі, прынятага 4 гады таму. Артыкул 15 унійнай пастановы ад 1 ліпеня 1569 г. даводзіў, што «ад гэтага часу кароль не будзе склікаць ніякіх іншых соймаў для Кароны і Літвы, але назаўсёды толькі агульны сойм для гэтых абодвух народаў, як для адзінага цела, у Польшчы, там, дзе яго вялікасці каралю і сенату будзе здавацца найбольш спрыяльным» [2, *154*]. У супрацьвагу абавязковасці правядзення соймавых пасяджэнняў толькі на польскай тэрыторыі велікакняжацкая шляхта настойліва прапанавала соймы вальныя збіраць «на перемену: раз в Полще, у Варшаве, а другий — в Литве, у Вилни, в Берестю, або в Городне». Віленскім паслам прадпісвалася абараняць сваю прапанову слушнай матывацыяй «про далекость дороги», бо, «ездечы на соймы до Варшавы отсюль з Литвы, некоторым от полтораста мил ехати прийдеться». Пераадоленне такой адлегласці патрабавала ад ліцвінскіх

дэпутатаў значных фінансавых і матэрыяльных затрат. Выдаткаваць неабходныя сродкі ім бачылася праблематычным з прычыны «збуженя…тутошнего панства», якое было выклікана неўраджайнымі гадамі і баявымі дзеяннямі. Апошнім часам, як заўважала соймікаваўшая віленская шляхта, агульныя шляхецкія з'езды абвяшчаліся рэгулярна «так для воен, яко складаня податков частых». Таму вымушаны былі ліцвінскія паслы ставіць пытанне аб мэтазгоднасці пачарговага правядзення соймавых збораў у ВКЛ і Польшчы, бо скарб свой «не хотелися до конца обнажати так частым и далеким проездыкам» [1, а. 3].

Захады шляхты ВКЛ, каб вальныя соймы Рэчы Паспалітай адбываліся не толькі на польскіх абшарах і старшынствавалі на шляхецкіх з'ездах не толькі прадстаўнікі «польскага народу шляхетнага», практыкаваліся неаднойчы. Напрыклад, інструкцыя паслам на агульны сойм (Я. Кавечынскаму, Я. Жыжэмскаму) ад сойміка Менскага павета, якая была выдадзена 4 снежня 1608 г., утрымлівала наказ, «иж на том сойме маршалак мае быць з кола пасольскага з народу нашого…, власне урожоного абраны» [1, а. 3]. Дэлегаты ад Пінскага павета (А. Дольскі, П. Гарайскі) атрымалі 5 чэрвеня 1632 г. наказ падняць на з'ездзе галоўным у Слоніме пытанне, «калі наступіць чарга маршалка літоўскага кіраваць соймавым пасяджэннем, абы той адбываўся ў Літве, а менавіта ў Брэсце Літоўскім, бо места гэтае з'яўляецца цэнтральным і найбліжэй прылеглым да зямель каронных» [1, а. 4]. Урэшце, намаганні вялікакняжацкай шляхты праз 100 гадоў займелі пераможнае завяршэнне. На сойме 1673 г. было прынята рашэнне, паводле якога кожны трэці вальны сойм павінен быў збірацца ў «Вялікім княстве Літоўскім у горадзе Гародні» і на ім маршалкам абірацца адзін з мясцовых дэпутатаў [6, *230*].

Шляхта ВКЛ выказвала сваю незадаволенасць рэалізацыяй артыкулаў Люблінскай дамовы 1569 г., якая тычылася валютнага і мытнага саюзаў: «Манета як у Польшчы, так і ў Літве павінна быць паводле агульнай дамовы адзіная і роўная па вазе, пробе, ліку, каштоўнасці і вартасці… Кароль спрыяе ліквідацыі ў Польшчы і Літве ўсіх сухапутных і водных пошлін і мыт» [2, *153—154*]. На практыцы выкананне падобнай палітыкі абарочвалася, прынамсі для ВКЛ, адчувальнымі стратамі. Менавіта на гэта звяртала ўвагу ў 1573 г. віленская шляхта, фіксуючы, што «мыта…ходили мимо вряду пана падскарбего земского». У сувязі з недапушчальнасцю такіх рэчаў, ішла прапанова, каб мытныя зборы «от того часу все водле давного обычаю не в чией иной справе и шацунку, одно пана подскарбего земского было, и на потребы Речи Посполитой обернёны» [1, а. 7]. «По тые вси часы, по унии немалую утрату народ литовский на монете литовской поносил», — адзначалася на сойміку Віленскім у 1573 г. Галоўнай прычынай таму сталася прыпыненне дзейнасці манетнага двара («мынцы») ВКЛ, у выніку чаго «и на филипках (іспана-неапалітанскія талеры і паўталеры, якія былі контрмаркіраваны Віленскім манетным дваром у 1564 г. — П. Л.), и на почворных грошах великою шкоду приняли». Валютная сітуацыя вымушала шляхту ВКЛ адстойваць бесперапынную дзейнасць свайго манетнага двара і настойваць на абавязковай вытрымцы валютных курсаў польскага і літоўскага грошаў (апошні быў даражэй): «Кованя мынцы тут у Литве…абы знижона не была ку шкоде того панства Великого князства Литовского… А покуль мынца иншае постановиться с позволеньем обойга народу, абы яко дзеся, так и в Полще монета литовская заровна была брана, то ест два гроши литовские за полтретя (2,5 — П. Л.) гроша полских» [1, а. 7].

Наладжванне сужыцця ў адным дзяржаўным утварэнні патрабавала напачатку існавання Рэчы Паспалітай пераліку ўзаемазапазычанасцей двух даўніх суседзяў. Фінансавых і матэрыяльных прэтэнзій ВКЛ да Каралеўства Польскага было вельмі многа. На шляхецкіх сойміках яны паўставалі перыядычна, асабліва ў часы бескаралеўяў. Так, у 1573 г. да польскага боку былі прад'яўлены патрабаванні, каб «пенези на жолнеры, до Литвы с Полски обецаные, абыся заплата стала жолнером тым, которые…гетману полнаму литовскому служили…, жебы были посланы, и жолнеры за службу были контентованы (узнагароджаны — П. Л.)» [1, № 93, а. 4—5]. Таксама грошы «за жывность, которую жолнеры полские у нас тут в Литве брали, а не платили», ліцвінскі бок патрабаваў кампенсацыю ў 200 тыс. злотых, «бо мы не повиньни на том шкодовати» [1, № 93, а. 5]. На думку велікакняжацкай шляхты, адбылося непаразуменне з скарбам тыкоцінскім: «Скарб с Тыкотина, который так от их милости панов польских, яко теж и от панов литовских сполечне был запечатован, и также сполне мел быть отпечатован. Тепер без ведомости их милости панов рад Великого князства Литовского…ест отпечатован и вывезен, которого скарбу половину абы до Великого князства Литовского вернено» [1, № 93, а. 5]. Да польскага горада Тыкоціна былі вывезены таксама стрэльбы, якія захоўваліся «под гербом Великого князства Литовского у Вилни». Шляхта патрабавала, «иж бы назад, тут, до Литвы, на опатренье (забеспячэнне — П. Л.) стрелбою пограничных замков были вернены, бо на замкох украиных недостаток великий стрелбы» [1, № 93, а. 5].

Дзесяцігоддзе (1576—1586 гг.) каралявання Стэфана Баторыя было адзначана актыўнымі баявымі дзеяннямі ў Інфлянцкай вайне, у якіх прымала дзейсны ўдзел шляхта беларускіх зямель. Таксама гэты час азнаменаваны чарговымі саступкамі ліцвінскаму боку ў плане дзяржаўна-прававой самастойнасці ВКЛ і ўзрастаннем ролі шляхецкіх вярхоў ва ўладарна-судовых структурах краіны. Самы значны здабытак у адзначаным накірунку — з'яўленне асобнага Галоўнага трыбунала ВКЛ. Яго стварэнне было ініцыявана шырокім фронтам велікакняжацкай шляхты. Непасрэднай падставай для яе актыўных захадаў па арганізацыі вышэйшага апеляцыйнага суда ў ВКЛ было зацвярджэнне пастановай вальнага сойма 1578 г. у Варшаве дзейнасці Кароннага трыбунала. У адказ ліцвінскі бок выносіць пытанне аб утварэнні трыбунала ВКЛ на разгляд вальнага сойма 1579 г., а таксама звяртаецца непасрэдна да Стэфана Баторыя аб найхутчэйшым вырашэнні праблемы. Кароль Рэчы Паспалітай з увагай падышоў да запытаў і ў сваім лісце ад 29 красавіка 1580 г. паабяцаў рыцарскім станам ВКЛ у бліжэйшай будучыні задаволіць іх памкненні: «Ознаймуем тым листом нашим всим посполитым и кождому з особна кому то ведати належит их, што перво сего, на прошлом валном сойме Варшавском в року минулом 1579 были до нас донесены прозбы от панов рад наших и послов земских Великого князства Литовского около порадку справедливости, то ест отправованя опэляцый на суд наш господарский належачих… Але иж констытуцыя соймовая на том Варшавском сойме жадная не дошло, окром самого универсалу соймового, про то и тот порадок справедливости отсуживане апеляции и поправа артыкулов статутовых в нем описаных не выдана. А панове рады наши, княжата, панята, маршалки, врадники земские и дворные и вси станы рыцерство, обыватели панства нашого Великого князства Литовского, зъехавшися за листы и вэзванем иншим тут до места Виленского столечного у Великим князстве на конвокацыю ку намовам в справах и потребах военных, вси згодне одностайне (падкрэслена мной — П. Л.) чинили нам при-

поминанс и прозбу о выдане им того нового порадку справедливости около отправованя и отсуживаня апэляцыи» [1, ДП 3 7875].

Абяцанне задаволіць намаганні шляхты ВКЛ кароль стрымаў і, каб ураўнаваць функцыянаванне судовай сістэмы двух чыннікаў адзінай Рэчы Паспалітай, Стэфан Баторый падпісаў 1 сакавіка 1581 г. грамату аб усталяванні Галоўнага трыбунала ВКЛ: «Мы, господар, зложивши з особы своее тые вси суды, которые за отозванием або з апеляцыями по вси тые часы водлуг статуту и прав Великого князства Литовского нам, господору, судити и справовати належало, порядок новый отправованья тых всих судов ... уставуем и всим обывателем Великого князства Литовского ... уживать дозволяем и даем» [2, *158*].

Згодна каралеўскай пастанове, у створаным трыбунале галоўную ролю адыгрывалі прадстаўнікі шырокага кола шляхецкага саслоўя, якія на сойміках «каждое воеводство, земля або повет обирати мають и будут повинни межи собою особ годных, богобойных, цнотливых, прав и звычаев оного паньства Великого князства Литовского умеетных прав трыбунальских и оселых, то ест за воеводство по 2 особы, а с повету, где воеводства нет, так же по 2 особы... А тых судей обранье быти мает кого кольвек якого кольвек стану, будь с панов рад, албо врядников земских, або князев, панов, шляхты, кого сами похочуть, быле бы человека годного, не бракуючи особами» [2, *158—159*]. Тэрмін дзейнасці абраных на сойміках асоб у трыбунальскім судзе працягваўся толькі адзін год. Для выбрання на наступны тэрмін штогодна паўсюдна збіралі так званыя дэпутацкія соймікі.

Галоўным местам, дзе засядаў трыбунал ВКЛ, з'яўлялася Вільня. У сталіцы разбіраліся справы з ваяводства Віленскага (паветаў Ашмянскага, Лідскага, Браслаўскага) і Полацкага (на паветы не падзялялася). У ваяводскім цэнтры — Наваградку, трыбунал разглядаў справы паветаў Слонімскага і Ваўкавыскага, а таксама ваяводства Берасцейскага з аднайменным і Пінскім паветамі. Яшчэ ў адным ваяводскім месце — Менску, трыбунальскія засядацелі выносілі вердыкты па справах насельнікаў ваяводства Віцебскага (паветы Віцебскі і Аршанскі) ваяводства Менскага (паветы Менскі, Мазырскі, Рэчыцкі), ваяводства Мсціслаўскага (без падзелу на паветы) [2, *159*].

Судовая практыка Галоўнага трыбунала ВКЛ заўсёды была ў полі зроку шляхты беларускіх зямель. Гэта натуральна, бо тут разглядаліся нязгоды з рашэннямі павятовай адміністрацыі, апеляцыі па выраках гродскіх, земскіх, падкаморскіх судоў. Нездарма шляхта Ашмянскага павета ў 1590 г. запісала ў наказ сваім паслам на слонімскі генеральны сойм, каб яны прапанавалі дэпутатам стварыць яшчэ адну судовую інстанцыю, дзе б можна было даказваць сваю правату, бо абсалютнага даверу да Галоўнага трыбунала ў ашмянцаў не было [1, № 242, а. 8]. Скардзіліся на працу трыбунала таксама шляхціцы Наваградскага ваяводства ў 1598 г. Яны адзначалі вялікі тэрмін разгляду спраў у гэтай найвышэйшай судовай інстанцыі. Сваім паслам на вальны сойм (князю А. Хадкевічу і М. Окуню) наваградцы прапанавалі падняць пытанне аб выданні пастановы, згодна якой земскія і гродскія суддзі да ўдзелу ў працы Галоўнага трыбунала не выбіраліся [1, № 373, а. 3].

Найбольш прэтэнзій з боку мясцовай шляхты ВКЛ было да месца правядзення трыбунальскіх пасяджэнняў. Так, агульнавялікакняжацкі з'езд у Вільні 1587 г. заклікаў усталяваць такі парадак, каб дзейнасць Галоўнага трыбунала ВКЛ адбывалася толькі ў Вільні [1, № 165, а. 2]. У 1590-х гг. берасцейская шляхта настойвала, «абы трыбу-

нал ВКЛ праводзіўся толькі ў месце сталечным, у Вільні» [7, *419*]. У гэты ж час іх падтрымліваў соймік Ашмянскага павета, дзе ў інструкцыі 1596 г. паслам на вальны сойм даводзілася, «абы толькі ў адной Вільні, акрамя Наваградка і Менска, суды ўсе трыбунальскія праведзены былі» [7, 410; 1, № 352, а. 2]. Іх блізкія суседзі з Лідскага павета ў тым жа годзе дапоўнілі сваім голасам агульнашляхецкі хор: «Суды трыбунальскія, абы ў адным месцы, у Вільні, праводзіліся» [7, *410*; 1, № 354, а. 4]. Тлумачэнне падобнай дружнай пазіцыі (за выключэннем Наваградскага і Менскага ваяводстваў) перыферыйнай шляхты беларускіх зямель можна знайсці толькі ў нежаданні ўзвышэння нейкага ваяводскага цэнтра, акрамя ўстаяўшайся сталіцы — Вільні.

Самым драматычным і працяглым уяўляецца трэцяе бескаралеўе (1584—1587), якое зноў жа сутыкнула інтарэсы ВКЛ і Каралеўства Польскага, а таксама прывяло да ўнутраных канфліктаў у Кароне. Пры гэтым была падрыхтавана спрыяльная глеба для атрымання шляхтай ВКЛ новых саступак на сваю карысць, у першую чаргу ўвядзенне ў дзеянне падрыхтаванай трэцяй рэдакцыі Статута, які канчаткова, пасля зацвярджэння каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам III 28 студзеня 1588 г., умацаваў дзяржаўную самастойнасць ВКЛ у складзе канфедэратыўнай Рэчы Паспалітай. Статутавыя нормы ў працяг папярэдняй палітычнай практыкі скасоўвалі многія палажэнні Люблінскай уніі. Паказальна ўжо тое, што ў Статуце ніводнага разу не ўпамінаецца унія. Па зместу гэтага дакумента, сапраўднага заканадаўчага помніка, ВКЛ паўставала дзяржавай не толькі з асобным заканадаўствам, але і з уласнай тэрыторыяй, уладным апаратам, войскам, фінансамі. Згодна Статута, вялікі князь абавязваўся захоўваць дзяржаву — «Слаўнае…Вялікае княства, і ўсе землі да яе з даўніх часоў і цяпер належныя, у гонары, тытулах, сталіцы, высакароднасці, уладзе, заможнасці, вяршэнстве і ў іншых усялякіх прыналежнасцях, а таксама ў межах, ні ў чым не павінны змяншаць і адбіраць, ці прыніжаць але яшчэ ўсё тое прымнажаць жадаем і будзем» [3, арт. 1, *111*].

Перад гаспадаром была пастаўлена цяжкая ўмова выканання антыпольскай праграмы вяртання адлучаных ад ВКЛ тэрыторый: «…тое, што было непрыяцелямі гэтай дзяржавы адарвана, разабрана і да іншай краіны ад той дзяржавы нашай калісьці прывернута, то ўсё ва ўласнасць гэтага Вялікага княства вярнуць, далучыць і межы направіць абяцаем» [3, арт. 4, *114*].

Артыкул 12 раздзела III статута 1588 г. адмяняў надзвычай прынцыповы для палякаў пункт пастановы Люблінскага сойма 1569 г. аб дазволе ім набываць зямельную ўласнасць і дзяржаўныя пасады ў межах ВКЛ: «Мы, гаспадар, абяцуем і клянемся…у тым панстве, Вялікім княстве Літоўскім, і ва ўсіх землях, якія яму належаць, званняў духоўных і свецкіх, гарадоў, двароў, старостваў, трыманняў, пасадаў мясцовага і цэнтральнага кіравання…ніякім чужаземцам і замежнікам, а ні суседзям гэтага панства даваць не маем. Але ўсё тое мы і нашчадкі нашыя, вялікія князі літоўскія, даваць будзем павінны толькі Літве, Русі, Жамойці, родзічам старажытным і ўраджэнцам Вялікага княства… А хто б з чужаземцаў, загранічнікаў і суседзяў гэтага панства, і ўсіх зямель яму належных, асмеліўся што-небудзь з таго прыдбаць, узяць і ў валоданне ўступіць, а калі яму напомняць аб аддачы, адразу не верне, тады маёмасць яго цалкам павінна быць узята…да скарба нашага Вялікага княства Літоўскага» [3, арт. 12, *118*].

Прыняцце Статута 1588 г. — гэта, безумоўна, вынік актыўнай шляхецкай пазіцыі ў яго падтрымку. Яшчэ ў працэсе каралеўскіх выбараў 1587 г. студзеньскія агульна-

велікакняжацкія шляхецкія з'езды ў Вільні настойвалі, «каб статут новы быў ухвалены» [1, № 165, а. 2]. На гэтых жа сходах апрабіраваліся на ўспрыняцце польскім бокам і кандыдатамі на каралеўскі пасад будучыя статутовыя нормы: «нiякiя чужаземцы…да жадных врядов, абы не былi дапушчаны» [1, № 167, а. 2]. Жорсткая канфрантацыя ў польскім грамадстве пры выбарах караля, у гэтай сітуацыі вымушанасць шведскай кандыдатуры Жыгімонта Вазы падтрымліваць ліцвінскія заканадаўчыя антыпольскія ініцыятывы прывялі да ўмацавання ў канцы 80 — пачатку 90-х гг. XVI ст. упэўненасці шляхты ВКЛ у сваёй моцы, што гарантавала ёй абарону ўласных правоў і спараджала настроі на вяртанне старых запазычанасцей і атрыманне новых выгод ды набыткаў ад унійнага саюза з Польшчай.

Асноўнымі канфліктнымі момантамі адносін ВКЛ з Каронай былі, па традыцыі, тэрытарыяльныя прэтэнзіі і грашовыя ўзаемаразлікі, што тычыліся ў першую чаргу фінансавання войска і знешнепалітычных ваенных і дыпламатычных акцый. Шляхта ВКЛ, як галоўны падаткаплацельшчык і фінансавы кантралёр, пільна сачыла за выдаткаваннем скарбовых грошай і магчымасцю іх эканоміі за кошт польскага боку. Перад судзяржаўнікамі ў неспрыяльны для Польшчы 1587 г. велікакняжацкай шляхтай на віленскай канвакацыі быў пастаўлены практычна ультыматум: «дапамога ў абароне ад братоў палякаў, абы не толькі людзьмі была, але і грашыма. Калі ж не маглі грашыма, то над людзьмі палякамі павінен стаяць у Літве гетман літоўскі, а не польскі» [1, № 165, а. 2].

На трэці год свайго каралявання Жыгімонт III паставіў перад шляхтай беларускіх зямель пытанне аб «недастатку скарбу» каралеўскага і прапанаваў абмеркаваць яго на павятовых сойміках. Ашмянская шляхта ў 1590 г. на каралеўскі запыт дала саркастычны і павучальны адказ: «Ино тая старая песнь не в смак нам прыходила слухати. Кгды же мы, народ литовский, недавно, на прошлом сойме, хоч не з жадное повинности, але с хути а милости нашое…, ухвалили побор, то ест подвышеня мыт». Адна частка прыбыткаў ад гэтага падвышэння павінна была ісці на дапамогу скарбу і каралеўскаму двару. Але на будучае шляхта не хацела браць на свае плечы ўвесь цяжар утрымання каралеўскай адміністрацыі і прапаноўвала ўраднікам забяспечваць сваю дзейнасць ды існаванне з тых ільгот і магчымасцей, што ім даравaліся, прынамсі, ад выкупу каралеўскіх зямель [1, № 242, а. 5].

У тым жа 1590 г. на сойміках у беларускіх паветах была пастаўлена праблема аб разглядзе аплаты за службу «руским жолнером под часом интерекгии (міжкаралеўя — П. Л.) там, в Коруне, прынятым». На што тыя ж ашмянцы далі належную водпаведзь: «Тот мы артыкул и реч тую розумеем быть вскзаную только до их милости панов обывателей Коруны Польское, которые их прыймовали и ховали. А нам то не належыть. Кгды ж и мы в Литве часу интерекгии свою украину людом служебным опатровали, а у их милости за то заплаты не упоминаемся» [1, а. 6]. Падобная сітуацыя склалася і ў справе аб выплаце жаўнерам грошай за службу ў Інфлянтах. Калі было прапанавана ўсім абывацелям Рэчы Паспалітай вырашыць гэта пытанне, то соймікаваўшая ў 1590 г. у беларускіх паветах, прынамсі Ашмянскім, шляхта прадставіла інфармацыю аб тым, што камісары, якія былі сёлета ў Рызе (канцлер ВКЛ Л. Сапега, паны Бонар і Бецкі), даклалі, што жаўнерская зарплата будзе выплачвацца «з места рызского и вжо им почато по ратом (часткам — П. Л.) платити. А иншим инфлянским жолнером нехай их милость станы корунные о заплате обмышляють, кгды ж теж они добра земли Инфлянское мало не вси держали

и тепер держать. А народ наш литовский еще велми до малое частки нам тых добр тепер прыходити почал, для чого не повинен той заплате первшых жолнеров подлегати» [1, а. 7].

У першыя паслялюблінскія дзесяцігоддзі велікакняжацкая шляхта падзяляла бюджэтныя выдаткі на агульнадзяржаўныя справы, пры гэтым з насцярожанасцю адносілася да каралеўскіх пажаданняў выплат на іншыя патрэбы. Так, у 1590 г. Жыгімонт III звяртаўся да шляхты беларускіх зямель з прапановай падтрымаць грашыма сям'ю нябожчыка пана Пенкаслаўскага, паляка па паходжанню, які меў шмат заслуг перад грамадствам. Мясцовая шляхта адрэагавала такім чынам, што ёй прыемна ўсведамляць пра непакой караля Рэчы Паспалітай аб пенсіі нашчадкам заслужаных перад Айчынай людзей, але пры гэтым, «маючы будеть рачыл, бо народ литовский то не заходить, кгды ж и у себе досыть такеж людей заслужоных ремеслом рыцарским маем, которым ся заплата и нагороды про недостаток скарбу еще не стала» [1, а. 6]. Відавочна, разумення адзінай Айчыны ў другой палове XVI ст. у палякаў і ліцвінаў яшчэ не склалася.

Два дзесяцігоддзі з лішкам, што мінулі з моманту гвалтоўнага далучэння да Польшчы ўкраінскіх зямель ВКЛ, якія знаходзіліся ў складзе гэтай дзяржавы з другой паловы XIV ст., не змаглі суцішыць горыч, шкадаванне і цяжкасць страты для велікакняжацкай шляхты. Яшчэ часцяком на шляхецкіх сойміках, як тое было ў Ашмянах у 1590 г., эмацыянальна выказвалася незадаволенасць учынкам і гучаў заклік да караля, польскага ўрада і вальнага сойма выправіць колішнюю памылку: «...Оторванье от нас тых панств...завжды раною тяжкою в сердцах нашых зостаєть. Просити и упомнетися панове послове нашы паном поляком мають о привернєнье их зас под наш реимент князства Литовского, же бы там сумненье свое перед паном богом очыстили, а нам в том милость повинную отдали» [1, а. 2]. Калі ж захады па вяртанні Падляшша, Валыні, Падолля, Кіеўшчыны не прынеслі плёну, то не аднойчы на павятовых сойміках у канцы XVI — першай трэці XVII ст. гучалі патрабаванні, каб вызначыць канкрэтныя межы паміж ВКЛ і Польшчай, для чаго правесці дакладны падзел ваяводства Берасцейскага і павета Гародзенскага з Падляшшам, зямлі Мазырскай з паветам Кіеўскім.

Далікатная памежная справа расцягнулася на дзесяткі гадоў і ўвесь гэты час адзначаліся канфліктныя сітуацыі ў паграінічных раёнах. Так, у 1597 г. шляхта Берасцейскага ваяводства даручала сваім паслам на вальны варшаўскі сойм, каб яны падднялі і вырашылі пытанне аб вызначэнні дакладнай мяжы, якую павінна правесці спецыяльна створаная польска-велікакняжацкая камісія. Два разы яна павінна была сабрацца і выехаць да граніцы Берасцейскага ваяводства і кароны Польскай. Але зрабіць тое не ўдалося «за невыеханем камісараў каронных». Адсутнасць дакладна вызначаных межаў прыводзіла да сітуацыі, калі «абываце лі ваяводства Берасцейскага з уласнага іх ваяводства і павета да іншых паветаў, прынамсі да Мельніка, прыцягваюцца, і на трыбунал каронны выклікаюцца і судзяць шляхціцаў тыя, пад чыю юрысдыкцыю і правы яны не падпадаюць, адкуль іх і на сойм выцягваюць. Маюць цяпер падтрымаць паны паслы, каб таму канец быў пакладзены, а ваяводства наша Берасцейскае ў сваіх межах даўніх было захавана, і браты нашыя не былі выкліканы ды суджоны суддзямі, якія не маюць на тое права, і дэкрэты тыя, што імі былі вынесены, каб былі анулявaны. Каб пытанне для братоў нашых было вынесена і вырашана на будучым сойме» [8, *152*].

Але ні на бліжэйшым, ні на наступных соймах памежная спрэчка паміж ВКЛ і Польшчай не была ўладкавана. Праз паўтара дзесятка гадоў на вальным сойме Рэчы Паспалітай адбыўся казус, які выклікаў бурны пратэст ліцвінскай шляхты на віленскім агульнавелікакняжацкім з'ездзе 1613 г.: «Канстытуцыя 1611 г. аб размежаванні ваяводства Берасцейскага з ваяводствамі кароннымі — Люблінскім і Падляшскім, несправядлівая і супрацьпраўная. Яна падрыхтавана прыватным чынам, без волі і згоды ўсіх. І пасля сойма да канстытуцыі была ўпісана. У такім выпадку пастанаўляем і абяцаем сабе, што мы, паслы, якія на будучых аўторкавых выбарах паслоў на сойміках справаздачу з таго з'езда галоўнага Віленскага рабіць будзем, прасіць будзем братоў сваіх, кожны ў ваяводстве сваім, каб у інструкцыях паслам сваім на наступны сойм даручылі, каб у будучым з агульнай згоды тая канстытуцыя была прынята» [9, *336—337*]. Але да прыняцця ўзаемазадавальняючай канстытуцыі ў часы каралявання Жыгімонта III справа так і не дайшла. Прычым, праца сумеснай памежнай камісіі прыводзіла часам да міждзяржаўных канфліктаў. Так, у 1617 г. шляхта Берасцейскага ваяводства выказала пратэст супраць далучэння да Польшчы часткі тэрыторыі ВКЛ: «Мы, сенатары, асобы, якія займаюць земскія і гродскія пасады, шляхта, жыхары Берасцейскага ваяводства…. Урачыста прыносім скаргу на.. камісараў з боку Кароны Польскай, якія былі накіраваны соймам для правядзення мяжы паміж Падляшскім і Берасцейскім ваяводствамі. Да нас дайшлі чуткі, што…яны быццам бы разглядалі памежныя дакументы Кароны, выслухоўвалі паказанні адносна межаў і вызначылі граніцы, адрэзаўшы на карысць Кароны некалькі тысяч валок уладанняў княства Літоўскага, …якія спакон веку складалі землі Літоўскага княства. Паведамленне аб усталяванні гэтых межаў яны быццам бы накіравалі на сойм да зацвярджэння. Калі б гэта здарылася, мы б такі ўчынак камісараў Кароны ганьбавалі б як учынак, які недазволены не толькі паміж братамі, але і паміж чужымі народамі, і строга б асудзілі такі прыклад парушэння патрэбнага ўзаемнага даверу для навукі іншым… Калі б такія дзеянні, што супярэчаць годнасці і братэрскай любові, сапраўды былі ўчынены іх міласцямі камісарамі Кароны, тады мы ўрачыста ўносім супраць іх пратэст, як супраць дзеянняў недапушчальных, што зневажаюць братэрскую любоў і давер. Не жадаем іх ведаць, лічым законнымі старыя межы Берасцейскага ваяводства да тых пор, пакуль не надыдзе дабраахвотнае і ўзгодненае размежаванне, а таксама патрабуем, каб была захавана колішняя падсуднасць падкаморскіх, земскіх і гродскіх судоў» [2, *175—176*].

Штогадовыя пратэсты, соймавыя абмеркаванні не прыводзілі да кансенсусу прадстаўнікоў княства і кароны ў вырашэнні памежнага пытання. Яно стала традыцыйным для шляхецкага абмеркавання на павятовых сойміках і генеральных соймах. У 1618 г. правесці дакладны падзел паміж Берасцейскім ваяводствам і Падляшшам, Мазырскім паветам і Кіеўшчынай патрабавала шляхта Віленскага павета [1, № 639, а. 6]. Двойчы, у 1618, 1619 гг. падымалася праблема межаў на генеральным сойме ў Слоніме. Прычым матывацыя да хутчэйшага вырашэння канфлікту заключалася ў тым, што «паны каронныя не мелі маёнткаў, трыманняў, грунтаў здаўна ў Вялікім княстве Літоўскім» [1, № 683а, арк. 4—5, № 708, а. 2]. У 1620 г. наказ аб упарадкаванні межаў ВКЛ атрымалі паслы на вальны сойм ад Менскага ваяводства [1, № 730, а. 3]. З прапановай паскарэння вырашэння камісіямі мозырскай і берасцейскай пытання размежавання зямель выступіла ў 1625 г. шляхта зноў жа Менскага, Трокскага ваяводстваў ды Ашмянскага павета [1, № 936, а. 5; № 940, а. 2; № 944, а. 5]. У 1627 г. ваяводства Навагрудскае ўзяло

на ўлік гэтае пытанне. Праз тры гады тое ж зрабіла шляхта Ашмянскага павета. Нарэшце, Пінскі павет у 1632 г. заявіў аб тым, што «церпіць крыўды з Валыні і ўсправедлівіць іх цяжка» [1, № 978, а. 4; № 1035, а. 4; № 1086, а. 4].

Немажлівасць звароту ўкраінскіх зямель дазволіла шляхце ВКЛ паставіць перад польскім бокам пытанне аб абароне паўднёвых межаў Рэчы Паспалітай ад пагрозы нападаў татараў сваімі ваенна-фінансавымі сродкамі. Згодна думцы шляхты Ашмянскага павета, выказанай у 1590 г., «што ся дотычеть небезпечности вперед от цара перекопского, тому нехай ся через их милость панов поляков забегаеть и обороны даеть с тых провинций Подляша, Волыня, Киева, Подоля, которые с пожитки их от реименту нашого, Великого князства Литовского, панове поляцы без жадного права, суду и справедливости под свой реимент корунный оторвали и отлучыли» [1, № 242, а. 2].

Сваю пазіцыю ашмянскае шляхецтва не змяніла і праз 8 гадоў. Сваім паслам (Г. Пельгрымоўскаму і Я. Корсаку) на вальны сойм 1598 г. яно прадпісвала давесці да ведама дэпутатаў вышэйшага сходу Рэчы Паспалітай, што «татар таксама трэба прытрымаць, каб не мелі прычыны на нас нападаць, але ў Вялікім княстве Літоўскім на тое ўжо ніякіх падаткаў складаць не варта, бо тычыцца гэта праблема скарбу польскага з прычыны, што межы гэтыя зараз польскія» [1, № 371, а. 2]. Падтрымлівала ашмянцаў на сойміку 1598 г. ваўкавыская шляхта, якая канстатавала, «каб упамінкі татарам Валынь і Падляшша сплачвалі, як было тое, калі былі яны часткай Вялікага княства Літоўскага» [1, № 401, а. 3]. Той жа думкі прытрымлівалася шляхецкае прадстаўніцтва Лідскага павета [1, № 354, а. 4]. У 1611 г. у інструкцыі Менскага павятовага сойміка паслам на галоўны сойм увогуле прадпісвалася падняць і вырашыць пытанне, каб «жаўнер каронны не хадзіў цераз ВКЛ на Маскву, але праз Кіеўскую зямлю, бо краіна гэтымі пераходамі разбурана» [1, № 565, а. 2].

Яшчэ адзін тэрытарыяльны канфлікт з Польшчай, у якім шляхта ВКЛ адстойвала права на адзінаасобнае валоданне сваімі былымі землямі, адбыўся ў 1610-х гг. з-за Смаленска. Старажытная цвярдыня, што практычна з другой паловы XIV ст. з'ўлялася часткай ВКЛ і напачатку XVI ст. была далучана да Вялікага княства Маскоўскага, у чэрвені 1611 г. была здабыта войскам Рэчы Паспалітай падчас ваеннай выправы супраць Расіі. Адразу ўзнікла пытанне аб канкрэтным уладальніку адваяваных зямель. Ужо ў жніўні таго ж 1611 г. шляхта беларускіх зямель адзінагалосна пачала выстаўляць патрабаванні аб звароце Смаленшчыны і Северскай зямлі ў межы ВКЛ. У гэтым плане характэрна пазіцыя ашмянскай павятовай шляхты: «Смаленск і шмат замкаў Северскай зямлі, дзякуючы богу і яго каралеўскай міласці вернута. Паслам неабходна прасіць на сойме, каб землі гэтыя былі ва ўласнасці Вялікага княства Літоўскага, за асвячэннем яго каралеўскай міласці далучаны, і кожны, у каго здаўна ў той правінцыі, што належала і на што права прад'явіць, каб пры сваім заставаўся» [1, № 560, а. 1].

Нягледзячы на моцны ўціск з боку ліцвінскай шляхты, сойм Рэчы Паспалітай 1611 г. не задаволіў іх патрабаванні на валоданне Смаленшчынай. Гэта прымусіла канцлера ВКЛ Льва Сапегу выступіць з рэзкім пратэстам. Як адзначаў у сваім лісце да Януша Радзівіла напрыканцы 1611 г. кіраўнік вялікакняжацкага ўрада: «...браты нашыя палякі канстытуцыю напісалі народу нашаму шкодную..., прывілей напісалі сабе на Смаленск і на іншыя правінцыі і замкі, нібыта гэта ім кароль дарує, што ў Масквы возьмуць. Вымушаны быў учыніць пратэст супраць той канстытуцыі і таго дыплому» [11, *253*]. Шляхта беларускіх зямель, як і ўсяго ВКЛ, услед за канцлерам

была ўзрушана і абурана соймавым выракам. Паўсюдна на пасяджэннях соймікаў у студзені 1613 г. перад чарговым соймам пазіцыя Л. Сапегі была актыўна падтрымана. У Ашмянскім павеце ў рэзкай форме шляхта пастанавіла: «Дыплом, які на мінулым сойме быў уключаны ў канстытуцыю, каб адменены быў, а Смаленск і Северская зямля, паводле даўніх правоў і прывілеяў, да Вялікага княства Літоўскага інкарпараваны былі» [1, № 585, а. 2]. Менская павятовая шляхта на сойміку 8 студзеня таго ж 1613 г. з незадаволенасцю канстатавала, што мінулы сойм пастанавіў і каронная канцылярыя выдала пастанову аб адлучэнні ад ВКЛ княства Смаленскага і зямлі Северскай. Надалей, ужо з задавальненнем, адзначылася, што на тым жа мінулым сойме супраць гэтага вырака сойма падаў пратэст канцлер ВКЛ Леў Сапега. Паслам ад Менскага павета наказвалася на будучым агульным шляхецкім сходзе Рэчы Паспалітай не адступаць ад патрабаванняў адмяніць далучэнне да Польшчы адваяваных у Расіі памежных тэрыторый, а «каб пастанавіў сойм княства Смаленскае і зямлю Северскую…, як частку цела Вялікага княства Літоўскага прывярнуць. Не трэба з-за гэтага парушаць спакой дамавы» [1, № 583, а. 2].

Менавіта апошні аргумент аб «спакоі дамавым» адыграў вырашальную ролю ў неспакойны для Рэчы Паспалітай час вайны з Расійскай дзяржавай. Каб спыніць эскалацыю велікакняжацка-польскага супрацьстаяння, пасля працяглых дэбатаў вальны сойм і кароль Рэчы Паспалітай пайшлі на кампраміснае вырашэнне тэрытарыяльнага канфлікта: пасля заключэння Дэўлінскага пагаднення Польшчы ва ўладанне перадавалася Чарнігаўшчына і Ноўтарад-Северскія землі, да ВКЛ далучалася Смаленшчына і Старадуб.

Такім чынам, адносіны паміж двума чыннікамі адзінай Рэчы Паспалітай — ВКЛ і Каралеўствам Польскім, складваліся неадназначна. У апошняй трэці XVI ст. шляхта беларускіх зямель успрымала Польшчу як заходнюю суседку, зямлю не сваю, а чужую. У гэтым плане характэрна пазіцыя ліцвінскага шляхціца Івана Гарнастая, якую ён выклаў у сваім лісце ў пасляюблінскі час (пачатак 70-х гг. XVI ст.) да Ераніма Хадкевіча: «Што ся дотычеть еханья твоей милости ку его милости господару, и ражу, и прошу твою милость за то, абы ваша милость не рачился до Польши ехати, але кгды, даеть бог, его королевская милость до здешнего панства своего Великого князства Литовского рачить поехати, на он час ваша милость рачите на границах Лядских его королевскую милость поткати и привитати з нами, приятельми своими, лепей нижьли в чужой земли» [10, *143*].

Узаемастасункі «двух народаў» Рэчы Паспалітай развіваліся па-суседску. Яны і сябравалі, і канфліктавалі, пільна лічылі адзін у аднаго, што ў каго чужое. У гэтым плане ВКЛ прад'яўляла Польшчы шмат прэтэнзій, асабліва ў першыя пасля-люблінскія дзесяцігоддзі. Але пры ўсіх спрэчках і тэндэнцыях ВКЛ да аўтанамізацыі ні слова аб скасаванні уніі не было моўлена з ліцвінскага боку. Велікакняжацкую шляхту не пярестала падазраваць у сепаратызме, які меў бы на мэце разрыў саюза ВКЛ з Польшчай. Федэратыўная еднасць Рэчы Паспалітай была праверана на вытрымку ў часы трох бескаралеўяў 70—80-х гг. XVI ст. Так, у студзені 1576 г. маскоўскі цар Іван IV прапанаваў сваю кандыдатуру ці свайго сына Фёдара на велікакняжацкі стол, дапускаючы на польскі трон аўстрыйскага прэтэндэнта. Пры гэтым усходні гаспадар «обецуючы нам (шляхце ВКЛ — П. Л.) свободы, права и волности наши по звыклому обычаю держати, и иных надавати и прибавливати, и арцибискупов и бискупов в почтивости мети» [1, № 106 110, ак. 2]. У адказ паны

рады ВКЛ склалі ліст да Івана IV, дзе адзначылі, што розных манархаў з братамі-палякамі мець не могуць. Калі шляхта каронная выбера сабе каралём эрцгерцага Эрнста, тады ліцвінская будзе згодна, каб ён быў агульным манархам для Польшчы і ВКЛ. З вашай жа «милостью цесаром… хочем докончане учинити и на кождого неприятеля за один быти» [1, № 110, а. 2—3].

Праўда, польска-вялікакняжацкія адносіны базіраваліся не на артыкулах акта Люблінскай уніі, а на падставе дзяржаўна-заканадаўчых рэалій, якія абаранялі інтарэсы ВКЛ. Гарантаванасць неўмяшальніштва польскай шляхты ва ўнутраныя справы ВКЛ збліжала ліцвінскі набілітэт з адзінадзяржаўнай каронная палітычнай элітай. Першыя дзесяцігоддзі XVII ст. адзначаліся супольнымі рокашамі, усходнімі выправамі, абаронай ад ворагаў, а таксама агульнай зацікаўленасцю ў захаванні аднолькавых правоў і вольнасцей (пры наяўнасці і дзеяздольнасці статутных норм). Усё гэта інкарпаравала шляхту ВКЛ у «польскі народ шляхетны». 20-я гг. XVII ст. характарызаваліся аб'яднаннем палітычных інтарэсаў шляхецкіх станаў Польшчы і ВКЛ, што пацвярджалася словамі польнага велікакняжацкага гетмана Януша Радзівіла: «На гэты час у Рэчы Паспалітай нязгод і ўзбунтавання ніякага… няма» і «ніколі ў Польшчы і ў Літвы большай згоды не было, як зараз» [1, Кн. I, спр. 10371, а. 55—62].

## ЛІТАРАТУРА

1. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве. Архіў Радзівілаў. Аддзел II.
2. Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. Мн., 1959.
3. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Разд. III. Мн., 1988.
4. Historia Sejmu polskiego. T. 1. Warszawa, 1984.
5. *Лялькоў Ігар.* Рукапісныя крыніцы Нацыянальнае бібліятэкі Францыі па гісторыі зносінаў паміж Францыяй і Вялікім Княствам Літоўскім у новы час (XVI—XVIII стагодзьдзі) // ATHENEUM. Альманах гісторыі і культуры. Т. 1. Менск, 1998.
6. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мн., 1994.
7. Scriptores Rerum Polonicurum. T. XX. Kraków, 1907.
8. АВК. Т. 2. Вильно, 1867.
9. *Šapoka A.* Lietuva ir Lenkija po 1569 metu Liublino unijos. Kaunąs, 1938.
10. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа. Т. 1. Вильно, 1867.
11. Archiwum domu Radziwiłłów. N. 8. Kraków, 1895.